**Т.У.Ганчарова-Цынкевіч** (Беларусь, Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка)

# СПАДАРОЖНІЦА ЧАСУ: ПАЭЗІЯ УЛАДЗІМІРА ЖЫЛКІ

Уладзімір Жылка – паэт-рамантык, выводзіў нашу беларускую літаратуру да еўрапейскага гучання і значэння, далучыў яе да тых праблем, якімі жыла сусветная культура. Творчасць У.Жылкі стала значным дасягненнем беларускай паэзіі. Творы яго з самага пачатку былі прасякнуты пафасам высокіх ідэалаў і пачуццём духоўнасці. Ужо ў пачатковы віленскі перыяд словы цесна зрастаюцца з вобразамі ў такіх творах як “Беларусь”, “Віхор”, “Палімпсест”, напаўняючы іх пачуццём абавязку перад народам, пачуццём патрыятызму: *Беларусь, Беларусь – гэта дзей//І разумных, і слаўных прыклад;//Край вялікіх і дум, і людзей,//І бязвольна схіліўшыхся хат…* [“Беларусь”. 1, с.24]

У “Палімсесце” аўтар задумваецца над перыпетыямі гістарычнага лёсу сваёй Бацькаўшчыны і вяртанне да праўды ён звязвае з вызваленчым рухам на Беларусі:*Краіна родная! Так сталася й з табой.//Багацце й хараство твае прыроды//І прошласць слаўную змяшаў чужак з гразёй//І словы вывеў гідкія для зводу.//Але народны дух, разбіўшы мур турмы//,Здалеў вясковы бруд паганы змесці.//І з дзіўнай любасцю чытаем тое мы//,Што захавалася на палімпсесце.* [ “Палімпсест”. 1, с.35]

У гэтым вершы гучыць тэма памяці і слаўных гістарычных традыцый народа, якіх нельга вынішчыць. І ачышчэнне старадаўніх грамат ад бруду заваёўнікаў – задача адраджэння.

Буйным здабыткам віленскага перыяду стала лірычная паэма У. Жылкі “Уяўленне”, прысвечаная Леапольду Родзевічу – творчаму дарадцу аўтара, па запрашэнню якога ён і прыехаў у Вільню. Менавіта Л.Родзевіч надрукаваў гэту паэму ў газеце “Новае жыццё” ў 1923 годзе, калі сам паэт быў ужо ў Чэхаславакіі. “Уяўленне” – карціна свету, маштабнае абагульненне рэвалюцыйных змен на пачатку 20-х гадоў мінулага стагоддзя. Паэт стварае вобраз новай Беларусі і самога Беларуса:*Шырокаю тропай//У час гэты “Спакус”//На мапу Еўропы//Ўзышоў Беларус.//У лапцях лазовых,// Па світцы ручнік,// І светам Хрыстовым//Зіяе аблік.* [“Уяўленне”. 1, с.138]

У творы пануе гармонія ідэй і вобразаў, спалучэнне сімволікі са свабодным упляценнем фальклорных кампазіцый.

У.Жылка ў віленскі перыяд жыцця выявіў сябе тонкім лірыкам. Вершы яго пазначаны асаблівай меладычнасцю і мілагучнасцю, кранаюць шчырасцю і празрыстасцю інтанацый. Пачуццё вернасці Радзіме, яе мінуламу і будучаму з’яўляецца адным з вядучых матываў паэзіі Жылкі:*Шануем мы бацькоў імёны://Навука й прыклад нам яны;//І помнім мы і веча звоны,//І вольнасць роднай стараны.* [“Мы любім даўнія паданні”, 1, с.27]

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Верш “Мы любім даўнія паданні” напісаны на гістарычным матэрыяле пад уражаннем музеяў, архіваў і помнікаў пісьменства, якія паэт бачыў ў Вільні.

Паэт умее здабываць жыццёвую навуку і моц з няўдач, паражэнняў. З патрыятычнымі і гістарычнымі матывамі гэтага верша цесна пераклікаецца і такі твор, як “Дзед”. Вобраз Дзеда – гістарычны сімвал, які нясе жыццёвы вопыт пакалення, якое памятае паншчыну, сялянскія паўстанні і заўсёды гатовы падтрымаць маладых:*Ды хоць стары, а думку//Гадуе ўсё адну://Хоць перад смерцю ўбачыць//Свабоднай старану.* [“Дзед”. 1, с.32]

Гэтай тэме паэт прысвячае і такія вершы, як “Каваль”, “Замчышча”, “Пакліч” і інш.

На працягу 1921-1922 гг. у творчасці Жылкі з’яўляецца шэраг вершаў на пейзажную тэматыку, якія поўняцца цішынёй, спакоем, упэўненнасцю у дзень заўтрашні, нягледзячы на неспакой палітычных і ваенных падзей у краіне. У сваіх творах “Вецер”, “Вечарам”, “Пачуццё”, “Семуха”, “Раніцою”, “Туман”, “Чырванее захад ад марозу” і інш. аўтар выяўляе агульначалавечыя пачуцці і патрэбы, чаруе чытача вобразнасцю фарбаў навакольнага жыцця, музыкаю ветру і прасторы:*Вецер ўварваўся праз весніцы,//Пыл на дварэ крутануў.//“Вер, што жаданне здзейсніцца”//Ласцячы вуха, шапнуў.//Шпаркі і смелы ў захопленні//,Лёгка праскочыў праз плот,//Штось зашумеў між каноплямі,// Борза мінуў агарод…* [“Вецер”. 1, с.39]

Верш “Вецер” – узор тонкай і глыбокай пейзажнай лірыкі паэта. Малюючы пейзаж, аўтар умее зазірнуць у глыбіні чалавечай душы, чуйна назірае за рухамі і зменамі у прыродзе, ствараючы карункавы карагод з фарбаў жыцця:*На лістох, на траве//Заблішчала раса, //І ўзышла, і жыве//Ў небе зораў краса…* [“Вечарам”. 1, с.38]

Тонка арганізаваную пейзажную лірыку У.Жылкі можна параўнаць з паэзіяй М.Багдановіча. У ёй гучаць тыя ж прыглушаныя інтанацыі, пануюць паўтоны фарбаў, шапочаць сцішаныя гукі.

Лірычнымі згадкамі поўняцца творы паэта аб каханні (вершы “Каханне,” “Скажы”, “Незразумелае”, “Зацвілі твае вочы між тлуму…”, “Марта” і інш.). Тэма кахання ў паэзіі У.Жылкі набывае адпаведныя часу барвы і адценні, атрымліваючы свежае гучаннне. Паэт вырашае сваю творчую задачу набліжэння беларускай паэзіі да еўрапейскай і сусветнай. У яго разуменні пачуццё кахання заўсёды напоўнена агульначалавечай шырынёй і праблемамі жыцця – ад хараства да брыдоты. Гэта хараство жыве ў прыродзе, складае гармонію свету прыроды, а цяпер носьбітам хараства павінен стаць чалавек і чалавечыя адносіны:*Няясны і трывожны сны людства,//І блудны цёмныя яго дарогі,//Але па-над буддзённыя трывогі//Узносіць нас туга да хараства…*[“Хараство”. 1, с.57]

І гэту красу паэт-рамантык шукае ва ўсім: у жыцці, у душы, у адносінах.

У творах пра хараство і каханне Жылка стварае сваю канцэпцыю цялеснага і духоўнага кахання. Па-новаму прадстаўлена каханне ў вершы “Марта”. Паэт асэнсоўвае біблейскі сюжэт пра сясцёр уваскрэшанага Лазара

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Марыю і Марту, якія запрасілі Хрыста, каб падзякаваць і пачаставаць збавіцеля. Ролі сясцёр падзяліліся: прыгожая Марыя, закаханая ў Хрыста, стала гаварыць з госцем інтымна, а нязграбная Марта ўзялася гатаваць вячэру. Да яе далятаў шчаслівы голас сястры і яна адчула сябе пакрыўджанай, падыйшла і спытала, чаму яна павінна працаваць, а сястра – не. Хрыстос адказаў, што яна занята больш важнай справай. Аўтар падыйшоў да біблейскага сюжэта свабодна, сцвердзіўшы глыбока псіхалагічнае ўздзеянне на мужчын прыцягненне непрыгожай Марты:*Імя, як ноч, глухое – Марта//Не зачаруе чулы слух,//Пагляд прыцішаны, упарты//Лятункамі не ўскрывіць дух.//Вось гэткую, Хрысце, ў Бетане//Ты знаў, як я, ў сваю пару,//Марыі, ўзвышанай каханнем,//Затурбаваную сястру.* [“Марта”. 1, с.53-54]

У творы выказана думка, што каханне і краса нараджаецца ў будзённым жыцці.

Лёс падараваў паэту такую ж хваробу, як некалі Максіму Багдановічу, таму відаць, матывы смерці часта пранікаюць у інтымныя і любоўныя вершы:*Ты жыццём, нібы жытняй мяжою,//Паступаеш свабодна і пэўна,//Я агорнуць снежнай імглою, - //На шляху маім вее завеўна.* [“Вершы спадзявання”. 1, с.85]

Каханне ў паэзіі У.Жылкі выступае яшчэ і той гаючай сілай, якая лечыць ад нягоды, бяздзейнасці, прымушае верыць у лепшае, вяртае да прыгажосці і гармоніі жыцця. Цыкл “Вершы спадзявання” – пра каханне і красу чалавечых узаемаадносін:*О мармур светлага чала//Пад пасмамі глухой завеі!//О тонкіх рук, о рук лілеі...//О хараство зялёнай пальмы!Ты ўся звініш напевам псальмы* [“Вершы спадзявання”. 1, с.83]

Вершы такога зместу і сіле эмацыянальнага ўзрушання ў тыя далёкія гады ў беларускай літаратуры фактычна не было. У.Жылка, арыентуючыся на творчасць Ф.Шылера, А. Міцкевіча, Г. Ібсэна, М. Лермантава, А. Блока, М. Багдановіча, стварае высокамастацкія паэтычныя шэдэўры, напаўняючы іх змест чыстай душы і высокім палётам думкі.

У 1925 годзе адметнай мастацкасцю творчасці паэта стаў лірычны цыкл “Вершы аб Вільні”. Ва ўяўленні аўтара горад Вільня – слаўная гістарычная памяць беларускага народа і ў той жа час надзея і чаканне змен у жыцці. У вершах выдатны мастак слова гаворыць аб сваім захапленні прыгажосцю горада – архітэктурнымі збудаваннямі, экзатычнасцю вуліц, рытмам жыццця ў ім:*Вялікай вуліцы экзотыка,//Тэатры і кіно, шпіталі://І маліцьвенна ўзносіць готыка//Да неба тонкія шпілі*...[“Вершы аб Вільні”. 1, с.75]

Паэма “Тэстамент” (1932-1933 гг.) – вяршыня творчасці У.Жылкі. гэты твор – філасофская рэч, грамадзянская споведзь, апраўданне паэта, яго сяброў і ўсіх тых, хто прысвяціў сваё жыццё адраджэнскай справе, апынуўшыся ў шквале тагачасных інтрыг і рэпрэсій. У.Жылка выказаў сваю запаветную мару і спадзяванне ў будучым убачыць Радзіму шчаслівай, без насілля і падману. У паэме сцвярджаецца думка аб адзінстве нацыянальных і сацыяльных мэтаў у грамадстве. “Тэстамент” захапляе высокай духоўнасцю лірычнага героя, здзіўляе глыбінёй мастацкага абагульнення, уражвае

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

пранiклiвым позiркам аўтара ў будучыню:*Ў цудоўнай сiле ўроды й моцы//Прадбачу я твае палi;//Праз забабоны, гнiль, суроцы,//Праз звады зла ўсе караблi//Маiх надзей i дум к затоцы//Вялiкай прышласцi плылi…* [“Тэстамент”. 1, с.147]

У.Жылка як пясняр не трацiць веры ў чалавека, паспытаўшы на сабе ўсе хiбы i перыпетыi жыцця. У паэме, малюючы працэс сваёй суровай эпохi, ён сцвярджае перамогу дабра над злом.

Уладзiмiр Жылка быў i застаецца велiчнай постаццю i эталонам у беларускай лiтаратуры. У сваёй творчасцi паэт аб’яднаў у адно цэлае iдэi сацыяльнага, нацыянальнага i духоўнага адраджэння. Яго паэзiя глыбока фiласафiчная i сацыяльная зрабiла станоўчы ўплыў на рамантычную плынь нацыянальнай лiтаратуры 20-х гадоў мiнулага стагоддзя, узбагацiла iнтэлектуальны узровень лiрыкi.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Лiтаратура**


1. Жылка, У. Выбраныя творы / У. Жылка. – Мiнск: “Беларускi кнiгазбор”, 1998.
2. Навуменка, I. Уладзiмiр Жылка / I. Навуменка // Роднае слова. – 2000. - № 4.
3. Сiцько, З. Палiмпсест: Спроба прачытаць некаторыя вершы Уладзiмiра Жылкi / З.Сiцько // Беларуская мова i лiтаратура ў школе. – 1990. - № 5.